Наталля Байдзіна

супрацоўнік аддзела традыцыйнай культуры
і аматарскай творчасці
Інстытута культуры Беларусі (г. Мінск, Беларусь)

# Музычны фальклор: бытаванне і выкарыстанне ў сучаснай культуры

Да «класічнага» аўтэнтычнага фальклору адносяць формы традыцыйнага музычнага фальклору, якія гістарычна склаліся да XX ст. Пад такімі формамі музычнага фальклору ў народнай традыцыі маецца на ўвазе старажытны пласт традыцыйнага музычнага фальклору, які ўключае каляндарна-абрадавы, сямейна-родавы, музычна-песенны фальклор, пазаабрадавую музычна-песенную творчасць, дзіцячы фальклор, а таксама больш позні пласт фальклорных твораў: сямейна-бытавую лірыку, балады, рамансы. Па словах В. Я. Гусева, «…живой фольклор немыслим вне быта, вне обычая, он сопровождает различные виды трудовой деятельности, вплетается в общественные и семейные праздники» [1].

Такі пласт традыцыйнай культуры адрозніваецца ўстойлівай жыццядзейнасцю ў нацыянальнай культуры Беларусі, паколькі старажытныя абрадавыя, песенна-музычныя, харэаграфічныя формы фальклору існуюць у жывым бытаванні, выконваюцца сучаснымі людзьмі, маладзёжнымі гуртамі ў розным сацыяльным асяроддзі і нясуць вызначаныя функцыі ў нашай культуры і грамадстве.

Формы існавання традыцыйнага музычнага фальклору, адноўленыя носьбітамі традыцыі і выканаўцамі-аматарамі, удзельнікамі розных фальклорных калектываў, розныя і ў аўтэнтычным, і ў неаўтэнтычным бытаванні. Прафесійнае выканальніцтва ў народных традыцыях і дзейнасць калектываў у жанры народнага хору ў клубнай мастацкай самадзейнасці не разглядаюцца ў дадзеным выпадку, бо іх рэпертуар



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

асноўваецца перш за ўсё на аўтарскіх творах і апрацоўках музычнага фальклору ў т. зв. стылі «народных» спеваў, што фарміруе набор уніфікаваных варыянтаў аўтэнтычнай і нацыянальнай культуры (песні, танцы, ігра на музычных інструментах).

На першы погляд, сучасная сітуацыя сведчыць аб выміранні традыцыі, якая непазбежна перарываецца з адыходам старэйшага пакалення. Але тут не ўсё так проста. Узроставая структура ўдзельнікаў побытавых (або аўтэнтычных) калектываў мае сваю логіку. Фалькларысты, якія назіралі за такімі ансамблямі, адзначаюць, што ўдзельнікаў маладзейшых за 40 гадоў у іх было мала заўсёды. Чалавек, жывучы ў асяроддзі, дзе бытуе фальклор, знаёмы з традыцыяй з дзяцінства, становіцца спеваком-майстрам толькі ў 40—50 гадоў. Тут ёсць свая заканамернасць, якая заключаецца ў своеасаблівай перыядызацыі прыцягнення чалавека да фальклору (а таксама ў фізіялагічным гучанні голасу маладзёжнай узроставай катэгорыі выканаўцаў — голас яшчэ не насычаны тэмбральна). Звычайна дзеці ахвотна ўключаюцца ў працэс фальклорнага мастацтва: завучваюць песні, танцы, удзельнічаюць у святах і абрадах, але падрастаючы, пачынаюць саромецца. Дасягнуўшы сярэдняга ўзросту, ужо маючы свае сем'і, дзяцей, дарослыя адыходзяць ад фальклору (дом, сям'я, гаспадарка, работа). Калі ж дзеці падрастаюць, з'яўляецца больш вольнага часу, таму веды аб традыцыях, навыках у выканальніцкім мастацтве, назапашаны з дзяцінства, зноўку прачынаюцца. Усё быццам бы пазабыўшы, яны пачынаюць пець, іграць на музычных інструментах, удзельнічаць у абрадавых дзеяннях сваёй лакальнай культуры, тым самым працягваючы, а не перарываючы традыцыю. Гэта азначае, што перадача традыцыі адбылася, хоць і не зусім так, як гэта было ў традыцыйнай музычнай культуры былых часоў. Традыцыя становіцца элементам сферы дасугу.



Існуюць актыўная і пасіўная формы бытавання фальклору. У актыўнай форме традыцыі арганічна бытуюць у народным ужыванні, у пасіўнай — захоўваюцца ў памяці. Частка старажытных відаў і жанраў фальклору (песні, танцы, некаторыя абрадавыя дзеянні) існуе толькі ў памяці пажылых народных выканаўцаў. З паўсядзённага побыту яны практычна знікаюць. Такія творы выконваюцца, у асноўным вясковымі спевакамі па просьбе збіральнікаў фальклору або фальклорнымі калектывамі са сцэны. Але, нягледзячы на гэта, пасіўная форма захавання фальклору не можа азначаць яго згубу, бо яна жывая ў памяці знаўцаў народных традыцый, захоўваецца імі і хоць бы час ад часу аднаўляецца ў паўсядзённым побыце, альбо ў сямейных абрадавых дзействах, альбо падчас экспедыцыйных даследаванняў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У фальклорнай практыцы ёсць выпадкі вяртання з пасіўнай формы ў актыўную форму бытавання фальклорных твораў, т. ч. адбываецца своеасаблівая «рэанімацыя» традыцыі. Гэтаму садзейнічаюць намаганні ўдзельнікаў, а таксама і даследчыкаў фальклору. Шматгадовая работа ў адным рэгіёне — правядзенне палявых запісаў, выяўленне і сумесныя выступленні носьбітаў фальклору, выканаўцаў (якія самі ўжо часта не збіраюцца), работа з народнымі калектывамі па запісу даследаванага матэрыялу на электронныя носьбіты, на радыё, на тэлебачанні, выступленне ў этнаграфічных канцэртах і г. д. — у многім садзейнічае папулярызацыі і «рэаніміраванню» напаўзабытых, а часцей і зусім забытых узораў традыцыйнай культуры. Дзякуючы дзейнасці збіральнікаў-фальклрыстаў павышаецца прэстыж народных выканаўцаў сярод сваякоў, вяскоўцаў, адміністрацыі.

Разам з тым, у тэндэнцыі захавання фальклорных традыцый вызначаецца скарачэнне сацыяльнай базы, перарыванне працэсу міжпакаленнай трансляцыі і распаўсюджвання фальклору. Звязана гэта з непазбежнымі і аб’ектыўнымі ўмовамі згасання вёскі, адтоку моладзі ў горад, арыентацыя вясковай моладзі і людзей сярэдняга ўзросту на стэрэатыпы гарадской і масавай культуры, якая практычна супрацьстаіць сваёй лакальнай і садзейнічае выміранню апошняй. Адбываецца паступовае размыванне асяроддзя і аслабленне сувязі паміж членамі гістарычна складзенага вясковага супольніцтва за кошт міграцыі насельніцтва і частковага змянення вобраза жыцця.

У сучасным ладзе жыцця вёскі, у параўнанні з пачаткам XX ст., адбыліся значныя змены, якія паўплывалі на светаўспрыманне людзей, для якіх частка старой культуры згубіла сваю значнасць і функцыянальнасць. З паўсядзённага побыту паступова сталі сыходзіць найбольш архаічныя формы музычнага фальклору, яны альбо забываюцца зусім, альбо пераходзяць у пасіўную форму захавання, альбо праходзяць адпаведную трансфармацыю.

Трансфармаванне гістарычна складзеных форм традыцыйнага музычнага фальклору і адаптацыя іх да сучасных умоў залежыць як ад становішча той ці іншай лакальнай культуры, так і ад відаў і жанраў музычнага фальклору. Як лічыць В. Я. Гусеў, у значнай ступені «ясны контуры современной структуры сохраняющегося традиционного фольклора и динамика процесса бытования его жанров: одни из них действительно безвозвратно уходят из повседневного обихода, другие сохраняют свою жизнеспособность, а некоторые — продуктивность» [1].



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Гістарычна складзеныя формы традыцыйнага музычнага фальклору, захоўваючы рэліктавую семантыку і знакава-сімвалічную сістэму выражэння, часта ўключаюць у сябе замененыя элементы з сучаснай сацыякультурнай сітуацыі. Трансфармацыя праяўляецца ў выглядзе разбурэння тэксту, фрагментавання, зліцця некалькіх фрагментаў у адзін тэкст, замяшчэння як асобных форм, так і істотных сэнсаў.

З'явілася ў сістэме перадачы традыцыі новая тэндэнцыя, якая інспіравана самімі фалькларыстамі-збіральнікамі, — вяртаць у звычайнае асяроддзе бытавання часткі ўжо згубленай фальклорнай спадчыны. Народным выканаўцам з архіўных фондаў перадаюцца гуказапісы, зробленыя 20—30 гадоў назад у дадзенай мясцовасці. Цяперашняе пакаленне носьбітаў традыцыі атрымлівае магчымасць пачуць галасы сваіх аднавяскоўцаў, якіх яны ўжо не засталі, і іх песні (такая ж практыка вывучэння традыцыйнага музычнага фальклору ўведзена ў сярэднеспецыяльных і вышэйшых навучальных установах). Шляхам шматразовага праслухоўвання адбываецца працэс завучвання і вяртання ў жывую традыцыю гэтых твораў.



Бытаванне гістарычна складзеных форм традыцыйнага музычнага фальклору на сучасным этапе вызначае функцыі, якія гэты пласт культуры выконвае ў сучасным грамадстве, у жыцці супольнасці (групы) і выканаўца.

На дадзеным этапе фалькларыстамі адзначаецца захаванне цікавасці да традыцыйнай культуры ў розных слаях насельніцтва. Прадстаўнікі творчай і навуковай інтэлігенцыі з 1980-х гг. XX ст. зацікавіліся традыцыйнай музычнай культурай мінулага ў сувязі з агульным ростам нацыянальнай самасвядомасці, патрэбы ў новым асэнсаванні гісторыі, перспектыў будучага самавызначэння. Апора на традыцыю разглядалася як адзін з магчымых інтэгрыруючых пачаткаў, шляхоў культурнай самаідэнтыфікацыі. Гэты працэс падхапіла моладзь, і ў 90-я гг. XX ст. з'явіўся шэраг маладзёжных фальклорных калектываў на традыцыйнай аснове.

Разам з захаваннем у аўтэнтычным асяроддзі традыцыйна-нарматыўных функцый умацоўваюцца яго дэкаратыўна-эстэтычныя функцыі, і на першы план выходзяць дэманстрацыйныя формы са згубай сапраўднай семантыкі.

Семантыка фальклору трансфармуецца часткова. Прыстасаванасць гістарычна складзеных форм фальклору да каляндарнага цыкла, да вызначанага жыццёвага сэнсу захоўваецца ў свядомасці носьбітаў традыцыйнай музычнай культуры. Замацаванасць уяўленняў народных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выканаўцаў аб функцыянальным прадвызначэнні фальклору ўспрымаецца імі, як кампанент вобраза жыцця, а не толькі як мастацкая творчасць, у сувязі з гэтым павышаецца прэстыж сваёй лакальнай культуры сярод сельскай моладзі.

Гарадскія жыхары, далучаючыся да каштоўнасцей традыцыйнай культуры, выконваюць тыя ж функцыі, што і вяскоўцы: яны ўплываюць на лад жыцця, светапогляд і светаўяўленне, некаторыя каштоўнасныя ўстаноўкі. Выконваючы фальклорныя творы, удзельнікі гарадскіх ансамблей імкнуцца па магчымасці захаваць іх сапраўдную семантыку. Стыль выканання твораў, якія адносяцца да гістарычна складзеных форм традыцыйнага музычнага фальклору, нясе пячатку строгасці і суадноснасці сітуацыі, і для выканаўцаў каштоўна і значна адчуванне сапраўднасці гэтай культуры і датыкальнасці да яе.

Гістарычна складзеныя формы традыцыйнага музычнага фальклору ў сучаснай культуры з'яўляюцца ланцужкамі, кожны з якіх вызначае цэласнасць, своеасаблівасць і непарыўнасць культурнай традыцыі.

На сучасным этапе развіцця традыцыйнай культуры, як і раней, паўстаюць пытанні захавання, аховы і трансляцыі. Гэта значыць, што час імкліва ідзе наперад і пытанні захавання народнай традыцыйнай музычнай культуры паўстаюць у новым сучасным вырашэнні і патрабуюць больш дасканалага, беражлівага і ахоўнага падыходу.



Спецыялісты ў сферы традыцыйнай музычнай культуры добра разумеюць гэтыя праблемныя напрамкі, як і патрэбу больш пільна і з асаблівай асцярожнасцю зберагаць той немалы назапашаны матэрыял, і, як не дзіўна, знаходзяць новыя, не менш цікавыя шэдэўры традыцыйнага музычнага мастацтва. Вялікае значэнне, як і раней, мае патрэба зберагання і захавання назапашанага матэрыялу, каб перадаць усё ў належным выглядзе нашым нашчадкам.

Праблема патрабуе немалых намаганняў і ад навукоўцаў, і ад саміх носьбітаў, якіх застаецца ўсё менш і менш. Неабходны новы этап даследавання традыцыйнай музычнай культуры, маюцца на ўвазе новыя палявыя даследаванні з мэтай аналізу сітуацыі на месцах, у якім стане, якія далейшыя шляхі захоўвання і распаўсюджвання традыцыйнай музычнай культуры.

Сучаснае грамадства і сучасны тып жыцця не даюць магчымасці адкладваць гэтыя даследаванні. Становішча ў вёсцы даволі складанае. Моладзь не застаецца, старэйшае пакаленне адыходзіць. Стварэнне аграгарадкоў прыносіць карэктывы: губляецца сувязь пакаленняў, а таму адбываецца перарыванне традыцый.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Цяперашняя задача ў распаўсюджванні традыцыйнай народнай культуры ў аграгарадках (традыцыйна — мястэчках) патрабуе падрыхтаваных спецыялістаў, якія, працуючы на месцах, будуць і надалей назапашваць і захоўваць творы традыцыйнага музычнага мастацтва.

Такім чынам, задачы па захаванню, ахове і далейшай трансляцыі традыцыйнай музычнай культуры на сучасным этапе развіцця нашага грамадства паўстаюць дастаткова складаныя, але трэба, не губляючы часу, абгрунтоўваць і вырашаць іх сумеснымі дзеяннямі.

*Спіс выкарастаных крыніц*

1. *Гусев, В. Е.* Эстетика фольклора / В. Е. Гусев. — Л., 1967.
2. Народная культура в современных условиях : учеб. пособие / М-во культуры РФ ; Рос. ин-т культурологи ; отв. ред. Н. Г. Михайлова. — М., 2000.



Яўген Сахута

доктар мастацтвазнаўства, прафесар,
вядучы супрацоўнік Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы НАН Беларусі
(г. Мінск, Беларусь)

# Сучаснае народнае мастацтва: праблемы бытавання і развіцця

Апошнія два дзесяцігоддзі вызначаюцца ростам цікавасці да набыткаў традыцыйнай мастацкай культуры Беларусі, актыўнай дзейнасці па яе адраджэнню, зберажэнню, развіццю, уключэнню ў сучасныя культурныя працэсы. Адраджаюцца многія яшчэ нядаўна амаль забытыя звычаі, абрады, традыцыі, узнаўляюцца з небыцця традыцыйныя рамёствы і промыслы, якія яшчэ нядаўна ў шырокай свядомасці звязваліся з учарашняй вёскай, лічыліся атрыбутамі мінулага, у лепшым выпадку — музейнай экзотыкай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ